www.gazeta.bsu.by

БДУ

# УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта 18 кастрычніка 2005 года, № 18 (1926)

## БДУ-NEWS

### ЗОЛАТА ЗА НАВУКУ

Тры залатыя медалі атрымала навукова-тэхнічная прадукцыя Белдзяржуніверсітэта на конкурсе інавацыйных распрацовак, які прайшоў у рамках міжнароднай выставы "Высокія тэхналогіі. Інавацыі. Інвестыцыі" ў Санкт-Пецярбургу. Сярод 6 распрацовак, прадстаўленых нашым універсітэтам, найлепшымі прызнаныя: шматфункцыянальны аўтаматызаваны спірометр "МАЗ-1", які выкарыстоўваецца ў медыцыне і дазваляе рэгістраваць аб'ёмныя, часавыя і хуткасныя параметры знешняга дыхання (удых і выдых); дызельнае біяпаліва і фітакампазіцыя ўзбагачальная селенаўтрымальная "Аўрора-7", прызначаная для выкарыстання ў хлебапякарнай прамысловасці.

Спецыялісты БДУ прывезлі з Санкт-Пецярбурга і два дыпломы. Гэтую ўзнагароду атрымалі тэхналогія перадпасяўной апрацоўкі насення гароднінавых культур і гідрагель поліэлектралітны "ГІСІНАР", які таксама выкарыстоўваецца для апрацоўкі насення гароднінавых культур.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ падрыхтавала Сняжана ЛІСОЎСКАЯ**

### СУМЕСНЫЯ ПРАЕКТЫ З КІТАЕМ

Ужо некалькі год БДУ шчыльна супрацоўнічае з КНР у сферы адукацыі, навукі і тэхнікі. А на мінулым тыдні наш універсітэт наведала дэлегацыя кіраўнікоў органаў дзяржаўнага кіравання навукі і адукацыі правінцыі Хэнань.

Падчас візіту першы прарэктар С.К. Рахманаў правёў прэзентацыю новых навукова-тэхнічных праектаў БДУ. Прапанаваныя распрацоўкі беларускіх навукоўцаў зацікавілі прадстаўнікоў кітайскай дэлегацыі, таму магчыма, што ў бліжэйшы час будуць рэалізоўвацца новыя сумесныя праекты з удзелам навукоўцаў нашага універсітэта. Акрамя таго, 8 кастрычніка БДУ прымаў удзел у навукова-практычным семінары "Актуальныя пытанні арганізацыйна-прававых асноў беларуска-кітайскага супрацоўніцтва ў сферы высокіх тэхналогій".

**Юлія ПАПОВА**

## ЮБІЛЕІ



### *Калектыву юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта*

***Дарагія сябры, паважаныя калегі і студэнты!***

*Шчыра віншую вас — выкладчыкаў, студэнтаў, аспірантаў, магістрантаў, выпускнікоў — з 80-годдзем юрыдычнага факультэта!*

*Прафесія юрыста заўсёды была запатрабаванай, цікавай і шматбаковай. Гэта складаная, адказная і патрэбная праца. Юрыст павінен быць прыкладам годнасці і гонару, кіравацца высокімі маральнымі прынцыпамі, заставацца дасведчаным у сваёй галіне, мець трывалыя веды, праяўляць высокі прафесіяналізм.*

*Памятайце, што адукацыя — гэта ваша каштоўнасць, духоўнае багацце, якое застаецца з чалавекам на ўсё жыццё.*

*Паколькі ў юбілейныя дні прынята дарыць падарункі, таму ад дзяржавы і універсітэта самы дарагі падарунак юрыдычнаму факультэту, усім студэнтам, выкладчыкам, супрацоўнікам — ваш новы корпус!*

*Жадаю вам шчасця, поспехаў, мужнасці, здароўя і кахання! Галоўнае — верыць у сябе!*

*Прыміце самыя шчырыя віншаванні з юбілеем!*

*Са святам!*

*Рэктар БДУ*
*прафесар В.І. СТРАЖАЎ*

*18 кастрычніка 2005 года*
*Мінск, БДУ*

**Матэрыялы, прысвечаныя юбілею юрыдычнага факультэта, чытайце на старонках 2-3.**

## ВЫСТАВЫ

# БЕЛАРУСКАЯ НАВУКА Ў ЛІТВЕ

***На IV Нацыянальнай выставе нашай краіны ў Літве "Беларусь-ЭКСПА — 2005" пад эгідай Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Беларусі навука была прадстаўлена такімі арганізацыямі, як Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Міністэрства адукацыі і БДУ.***



Выстаўка мела прадстаўнічы характар. Тым не менш, дэлегацыя БДУ атрымала ад Надзвычайнага і паўнамоцнага пасла Беларусі ў Літоўскай Рэспубліцы дыплом за актыўны ўдзел у выстаўцы. Далёка не ўсе арганізацыі-ўдзельнікі атрымалі такія знакі пашаны.

Распрацоўкамі БДУ сапраўды зацікавіліся. Пра гэта сведчыць велізарная колькасць кантактаў, якія ўдалося ўстанавіць з зацікаўленымі прадстаўнікамі мерапрыемстваў, а іх каля 50. Увагу надавалі пераважна распрацоўкам па двух кірунках — будаўнічым і экалагічным. Чым гэта абумоўлена? Па-першае, Літва зараз перажывае так званы "будаўнічы бум", калі адначасова ўзводзіцца мноства новых аб'ектаў, таму і нядзіўна, што прадстаўнікоў краіны цікавяць будаўнічыя матэрыялы, пакрыцці і г.д. А па-другое, у Літве рэзка ўзраслі патрабаванні да экалагічных стандартаў, якім надаецца вялікая ўвага ў Еўрасаюзе, куды цяпер уваходзіць краіна.

Кіраўнік дэлегацыі БДУ, начальнік Галоўнага ўпраўлення навукі Таццяна Аляксееўна Дзік адзначае, што прадстаўнікі беларускай дэлегацыі азнаёміліся з прынцыпамі функцыянавання літоўскіх тэхнапаркаў і бізнес-інкубатараў.

Па словах Таццяны Аляксееўны, першай і галоўнай задачай універсітэцкай дэлегацыі было найлепшым чынам прадставіць БДУ з мэтай падтрымкі міжнароднага іміджа і аўтарытэта вядучай ВНУ краіны. Па-другое, неабходна было папулярызаваць навукова-тэхнічную прадукцыю, распрацаваную падраздзяленнямі БДУ. На выставе былі прадстаўлены тэхналогіі, заснаваныя на мікрахвалявым уздзеянні на насенне гароднінавых культур, абсталяванне для сушкі драўніны. Акрамя таго, наведнікі маглі пабачыць абсталяванне і тэхналогіі для стварэння вырабаў з пенаполіурэтану, віртуальныя прыборы і многае іншае. Цікавыя распрацоўкі факультэта радыёфізікі і электронікі — вырабы са шкла з аб'ёмнай выявай унутры. Дарэчы, пры дапамозе гэтай распрацоўкі былі створаны сувеніры з сімволікай БДУ, якія атрымалі ў падарунак прадстаўнікі ўрадавай дэлегацыі. Яшчэ адной немалаважнай задачай універсітэцкай дэлегацыі было паведаміць пра інавацыйную дзейнасць БДУ. У рамках круглага стала "Актуальныя пытанні інавацыйнай дзейнасці беларускіх і літоўскіх навукоўцаў. Пытанні стварэння і ўдасканалення работы тэхнапаркаў" Таццяна Аляксееўна выступіла з дакладам "Навука і інавацыі ў БДУ".

**Ала МАЧАЛАВА**

**На фота:** начальнік Галоўнага ўпраўлення навукі БДУ Т.Дзік, прэм'ер-міністры Літвы і Беларусі А.Бразаўскас і С.Сідорскі, намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Беларусі У. Нядзелька.

ЮРЫДЫЧНАМУ ФАКУЛЬТЭТУ — 80 ГАДОЎ!

# ПАДЗЕЯ ДЛЯ ЎСЁЙ УНІВЕРСІТЭЦКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ



80 гадоў — гэта час станаўлення, развіцця і прызнання ў навучальна-метадычнай, навуковай, ідэалагічнай, выхаваўчай і практычнай дзейнасці.

80 гадоў — гэта высокая фундаментальная універсітэцкая падрыхтоўка студэнтаў і выпускнікоў, высокі прафесіяналізм усіх супрацоўнікаў факультэта. Я падкрэсліваю — усіх.

У гэтыя дні, падчас свята юрыдычнага факультэта БДУ, саюза ідэй і законатворчасці, прыміце шчырыя пажаданні творчых поспехаў і высокіх дасягненняў.

Цеплыні і ўтульнасці — вашым сем'ям і дамам!

Багацця — і матэрыяльнага, і духоўнага!

**Праарэктар па вучэбнай рабоце, доктар эканамічных навук, прафесар У.Л. КЛЮНЯ**

**Паважаныя юрысты, шаноўныя калегі!**

80-гадовы юбілей юрыдычнага факультэта БДУ — гэта знамянальная падзея вялікай значнасці і важнасці не толькі для юрыдычнай, але і для ўсёй універсітэцкай супольнасці краіны.

*Р.А. Васілевіч:*

# "ЮРЫСТ СЛУЖЫЦЬ СВАЁЙ ДЗЯРЖАВЕ І НАРОДУ"

***Рыгор Аляксеевіч ВАСІЛЕВІЧ не толькі кіруе Канстытуцыйным судом нашай краіны. Ён яшчэ і загадчык кафедры канстытуцыйнага права на юрыдычным факультэце БДУ. Напярэдадні юбілею факультэта ён пагадзіўся адказаць на некалькі пытанняў газеты "Універсітэт".***



**— Што для Вас азначае Белдзяржуніверсітэт?**

— Гэта ВНУ, дзе я атрымаў спецыяльнасць юрыста, навучаўся ў аспірантуры. Гэта унікальная магчымасць ведаць і вучыцца ў такіх выдатных юрыстаў сучаснасці, як прафесары А.А. Галаўко, С.Р. Драбязка, А.В. Дулаў, І.І. Марціновіч, В.Ф. Чыгір, Я.А. Юхо (ужо нябожчык) і інш. Яны сталі ў пачынанні перыяд каля вытокаў юрыдычнай адукацыі ў Беларусі.

**— Чым адрозніваецца юрыдычны факультэт сёння ад таго часу, калі навучаліся Вы?**

— Юрыдычная адукацыя развіваецца, мяняюцца стыль і метады выкладчыкаў. Цяпер у студэнтаў больш магчымасцяў, больш інфармацыі. Яны могуць цалкам засяродзіцца на навучанні: дзяржава цяпер, скажам, не прыцягвае студэнтаў да сельгасработ, як гэта было раней. Раней партыйныя органы шмат у чым вызначалі паводзіны студэнтаў і выкладчыкаў. Сёння асновай з'яўляецца Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь. У студэнтаў і выкладчыкаў ёсць цудоўныя светлы будынак.

**— Ці ёсць у Вас улюбёнае выказванне наконт адукацыі?**

— Гэта словы В.В. Ключэўскага: "Выкладчыкам слова дадзена не для таго, каб усыпляць сваю думку, а каб будзіць чужую".

**— Якія ў Вас ёсць пажаданні студэнтам і выкладчыкам юрыдычнага факультэта?**

— Калі сцісла, то студэнтам — талковых выкладчыкаў (менавіта такія працуюць на юрфаку БДУ), а выкладчыкам — студэнтаў, якія прагнуць ведаў. Канечне ж, усім — здароўя, дабрабыту. І каб памяталі, што юрыст служыць сваёй дзяржаве і народу.

**Вольга ІВАНОВА**

# ПРАЦА НА КАРЫСЦЬ РАДЗІМЫ

***Alma mater юрыстаў Беларусі рыхтуецца святкаваць свой юбілей. Гэта выдатнае свята для ўсіх, хто калі-небудзь вучыўся ці выкладаў на юрыдычным факультэце.***



Юрыдычны факультэт БДУ сёння з'яўляецца вядучым навучальным і навуковым цэнтрам падрыхтоўкі кадраў прафесіяналаў-юрыстаў, здольных паспяхова вырашаць юрыдычныя задачы дзяржавы і грамадства, працаваць як у сваёй краіне, так і за мяжой. Нашых выпускнікоў сёння сустрэнеш ва ўсіх сферах грамадства: у заканадаўчых і выканаўчых органах краіны, у сістэме судоў, адвакатуры, натарыяце, на прадпрыемствах усіх формаў уласнасці. Адным з галоўных паказчыкаў прававой культуры грамадства з'яўляецца прафесіяналізм і грамадскі статус юрыдычных кадраў.

Прафесія юрыста з'яўляецца прэстыжнай і вылучаецца асаблівай адказнасцю: ад яго рашэнняў і парадаў залежаць лёсы людзей. Нездарма антычныя мудрацы называлі права мастацтвам дабра і справядлівасці.

Нам удалося вельмі шмат зрабіць за некалькі апошніх гадоў. Цяпер у юрыдычнага факультэта БДУ ёсць свой корпус — месца, дзе ў бліжэйшыя гады юрфак будзе жыць, навучацца, працаваць і дасягаць новых вынікаў. Колькі задач стаіць перад намі!

Юрыспрудэнцыя актуальная ва ўсе часы. У нашага факультэта выдатная гісторыя, нам ёсць чым ганарыцца. Восем дзесяцігоддзяў найлепшыя розумы факультэта назапашвалі веды і досвед, якія мы выкарыстоўваем сёння. Традыцыі ж прававой думкі Беларусі сягаюць каранямі ў далёкую мінуўшчыну.

Наша задача ў тым, каб умацоўваць традыцыі і разам з тым не спыняцца на дасягнутым, пастаянна ўдасканальваць прафесійнае майстэрства выкладчыкаў, прыўносіць новае ў навучальны працэс. Мы па-ранейшаму ставім мэтай фарміраванне высокага ўзроўню правасвядомасці, творчага і навуковага мыслення будучых юрыстаў.

Традыцыі факультэта прадстаўлены на штогадовых кастрычніцкіх Днях юрыдычнага факультэта, у рамках якіх праводзяцца Міжнародная канферэнцыя студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў, святочныя мерапрыемствы і сустрэчы выпускнікоў. Традыцыйным у студэнцкім асяродку стала святкаванне Дня юрыста і правядзенне конкурсу "Лэдзі Феміда". Ініцыятарамі гэтых мерапрыемстваў выступаюць арганізацыі студэнцкага самакіравання: студэнцкі актыў, прафбюро, БРСМ, студэнцкая навукова-даследчая лабараторыя, студэнцкае навуковае таварыства. На факультэце выдаецца поўнакаляровая малатыражная газета "Остров "Юфъ". Студэнты юрыдычнага факультэта прымаюць актыўны ўдзел ва ўсіх мерапрыемствах, якія ладзяцца ў рамках БДУ: навуковых семінарах, канферэнцыях, конкурсах, культурна-масавых і спартыўных мерапрыемствах. Студэнты і магістранты факультэта неаднаразова станавіліся пераможцамі універсітэцкіх і рэспубліканскіх навуковых і іншых конкурсаў, спартакіяд. На юрыдычным факультэце штогод арганізуецца правядзенне Рэспубліканскай алімпіяды па правазнаўстве.

На юрыдычным факультэце пануе асаблівая атмасфера: некалькі пакаленняў выкладчыкаў і студэнтаў стварылі унікальнае брацтва.

Кожны член выкладчыцкага калектыву факультэта перадае свае прафесійныя веды студэнтам, каб яны маглі не толькі павысіць свой адукацыйны ўзровень, але і атрымаць пачуццё гонару за абраную прафесію, адчуць, што іх праца юрыста звязаная з вялікай адказнасцю за лёсы ўсіх людзей краіны і кожнага чалавека ў прыватнасці. Класічная юрыдычная адукацыя, атрыманая ў сценах факультэта, дазваляе юрыстам, работнікам у розных сферах дзейнасці, размаўляць на адной мове, паспяхова аб'ядноўваць свае намаганні ў вырашэнні практычных задач.

Хацелася б пажадаць усім нам: выкладчыцкаму калектыву, выпускнікам і студэнтам юрыдычнага факультэта — здароўя, шчасця, дабрабыту, поспехаў у навучанні і прафесійнай дзейнасці. Служыць закону, працаваць на карысць Радзімы — гэта ганаровы абавязак кожнага з нас.

**Дэкан юрыдычнага факультэта, дацэнт, доктар юрыдычных навук С.А. БАЛАШЭНКА**

**Артыкул «Развіццё універсітэцкай прававой навукі» чытайце на сайце газеты «Універсітэт» (www.gazeta.bsu.by).**

# РАЗВІВАЦЬ ДОБРЫЯ ТРАДЫЦЫІ

**Паважаныя выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты юрыдычнага факультэта!**



Шчыра рады павіншаваць усіх вас з юбілейнай датай у дзейнасці факультэта. Па сутнасці, наш факультэт — аднагодак Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Студэнты-юрысты былі ў ліку першых студэнтаў універсітэта. На працягу ўсяго гэтага перыяду юрыдычная адукацыя не заставалася без увагі дзяржавы. У адпаведнасці з указамі прэзідэнта ў Беларускім дзяржаўным універсітэце створаны Інстытут перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі суддзяў, работнікаў пракуратуры, судоў і ўстаноў юстыцыі, а таксама юрыдычны каледж. Разам з юрыдычным факультэтам яны ўтвараюць адзіную сістэму падрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі юрыдычных кадраў. Яшчэ адной прававой увагі з боку дзяржавы і кіраўніцтва універсітэта стаў пераезд факультэта ў новы корпус. Факультэт атрымаў выдатныя ўмовы для працы і далейшага развіцця. Я ўпэўнены, што калектыў юрыдычнага факультэта будзе і надалей на высокім узроўні выконваць сваё прызначэнне і забяспечваць патрэбы Рэспублікі Беларусь у высакаякаснай юрыдычнай адукацыі, а таксама працягваць і развіваць добрыя традыцыі, закладзеныя намі і нашымі папярэднікамі.

**Дырэктар Інстытута перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі суддзяў, работнікаў пракуратуры, судоў і ўстаноў юстыцыі БДУ, загадчык кафедры грамадзянскага права юрыдычнага факультэта, доктар юрыдычных навук В.М. ГАДУНОЎ**

# Юрфак са мной назаўжды!

*Ім па 20. Ці крыху больш. Яны маладыя і вясёлыя. Яму сёлета 80. Ці крыху больш. І ён таксама малады і вясёлы. Нягледзячы на ўзрост. Сваімі ўражаннямі ад вечна маладога юбіляра юрфака дзеляцца студэнты, якія віншуюць любімы факультэт з чарговым днём народзінаў.*

**Наталля ШЫШЛА, V курс, сакратар БРСМ юрыдычнага факультэта:**

Юрфак — гэта цікава. Вывучаць права Беларусі займальна. Калі я паступала, увогуле не ведала, што такое юрфак і з чым яго “ядуць”. Гэта і вабіла. Зараз юрфак прываблівае цікавымі людзьмі, з якімі шчасціць мець стасункі. Таму самыя яркія ўражанні — мая дарагая група, з якой, на жаль, давялося развітацца з-за размеркавання па спецыялізацыях. Ну, і Дзень факультэта ў ДК чыгуначнікаў. А яшчэ выкладчыкі: штогод у кагонебудзь ды закахаюся. Так што будзь я дэканам юрфака — не змяніла б нічога, хіба пакінула б першую змену.



**Людміла АРЛОЎСКАЯ, III курс, выпускніца юркаледжа БДУ:**

Мой юрфак пачаўся яшчэ класе ў шостым — з серыялам “Закон і парадак”, які ўсёй сям’ёй штотыдзень глядзелі і абмяркоўвалі. Тады і ўзнікла жаданне “прамацаць” юрыспрудэнцыю знутры. Таму я мэтанакіравана паступіла ў юрыдычны каледж БДУ, пасля — на юрфак. Каледж БДУ аказаўся вельмі карысным, бо дапамог вызначыцца, ці патрэбны мне юрфак. Але я, пэўна, адзін з тых ідэйных юрыстаў, што расчаруюцца ў сваёй справе, толькі калі карэнным чынам і не ў лепшы бок зменіцца сама прававая сістэма.

**Антон ВАШКЕВІЧ, выпускнік юрфака:**

Паступаў я добра і нават з імпэтам: мне якраз споўнілася на той час 18 гадоў, і войска мяне чакала з раскрытымі абдымкамі. Гэта сваю ролю адыграла: атрымаў 19 з 20 магчымых балаў. Пасля першай хвалі эйфарыі наступіла туга і нудота, і курсе на чацвёртым нават думаў, што выбар быў не зусім правільны: юрыстаў шмат, і на працу ўладкавацца немагчыма. І нягледзячы на тое, што студэнтам быў “узорна-пакаальным” і нават дыплом чырвоны ўмудрыўся атрымаць, на працы давялося ўсяму вучыцца нанова: упэўніўся на ўласнай скуры, што ў ВНУ даюцца толькі асновы прафесіі, далей усё залежыць толькі ад цябе.

**Яна ГАНКОВІЧ, IV курс, лепшая студэнтка юрфака ў 2004 годзе:**

Наконт паступлення ў мяне нават ваганняў не было. І так была здзіўлена гэтай атмасферай, і мноствам каларытных, незвычайных людзей. Я ў захапленні ад нашых студэнцкіх канферэнцый, у якіх бяруць удзел вельмі цікавыя асобы. І яшчэ больш канферэнцыі падабаюцца, калі месца дзеяння пераносіцца “ў кулуары”.

**Вольга БАКАЛЕНКА, III курс, старшыня прафкама юрфака:**

З 9-га класа ў нас пачалося размеркаванне па профілях — эканамічным, медыцынскім і юрыдычным. Эканоміка не вабіла абсалютна, медыцына тым больш. Што засталося? З трыццаці вучняў юрыдычнага класа на юрфаку апынулася толькі я. Астатнія 29, лічу, шмат што згубілі. Кіраўніцтва ў нас добрае і чулае, дае свабоду калі не поўную, дык вельмі вялікую. За што, дарэчы, вялікі дзякуй! Хаця больш за ўсё запомнілася не яно і не нашы святы (а яны ў нас, паверце, весялей не бывае). Запомнілася экскурсія ў легендарную “Валадарку”. Дзень быў якраз “у лепшых традыцыях жанру”: змрочны, цёмны, моцны дождж, хмарнае неба. І сам СІЗА — такі ж цяжкі. І ўражанне ад яго гнятлівае. Абсалютна супрацьлеглае ўражанню ад факультэта.



**Ганна БАРАНОЎСКАЯ, III курс, старшыня студэнцкага навуковага таварыства юрфака:**

Юрфак мне даспадобы, і тут сапраўды варта вучыцца. Люблю непасрэдныя стасункі паміж выкладчыкамі і студэнтамі. Люблю нашы Дні факультэта, і асабліва момант, калі ў залу ўносяць вялізны торт і ўсе пачынаюць гэтай смакатой адно аднаго пэцкаць: студэнты — выкладчыкаў, выкладчыкі — студэнтаў. Люблю рыхтаваць факультэцкую газету. Летась нашу нешматлікую рэдакцыю адправілі на “стажыроўку” на журфак. Нам расклалі па палічках усю тэхналогію вёрсткі ды яшчэ і зрабілі за нас газету, якая стала пераможцай конкурсу студэнцкіх газет БДУ. Дапамаглі... Люблю ўсе нашы мерапрыемствы, пасяджэнні студэнцкага навуковага таварыства, тым больш калі яны перарастаюць ў нефармальныя “капуснікі”.

**Дзмітрый ТРАЦЦЯКОЎ, V курс, “будучы дэкан факультэта”:**

Дзень свайго паступлення не забуду ніколі — 20 ліпеня 2001 года. Прыходжу пазней у школу, пытаюць:

— Паступіў?
— Паступіў!
— У тэхнікум?
— Не. У БДУ, на юрфак.
— На завочнае хіба?
— Дзённае.
— Ну, пэўна, платнае?
— Чаму? Бюджэт.

Школа была ў разгубленасці: 24 балы з 24 магчымых ад мяне ніхто не чакаў. Хаця з 9-га класа ішла мэтанакіраваная падрыхтоўка па чатырох прадметах. У нашай сям’і юрфак — ужо традыцыя: 22 гады таму факультэт скончыў мой бацька, пасля старэйшая сястра. Назіраў, як яна вучыцца, уцягнуўся, як кажуць. Спачатку хацеў у пракуратуру. Пасля — у адвакатуру. Зараз на раздарожжы. Можа, дэканам стаць? Пакідаць юрфак не хочацца — зацягвае. Ого-го! — як зацягвае. Аднаго хлопца так зацягнула — восьмы год ужо вучыцца: кідае, узнаўляецца, зноў кідае — але канчаткова развітацца ніяк не можа. Як кажуць, “юрфак са мной назаўжды!”



Марыя КАСЦЮКОВІЧ

## БДУ-NEWS

### СЛАВЯНСКІЯ ЛІТАРАТУРЫ Ў КАНТЭКСЦЕ СУСВЕТНАЙ

На філалагічным факультэце 12—14 кастрычніка прайшла VII Міжнародная навуковая канферэнцыя "Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай". Гэта адна з найбуйнейшых і найстарэйшых літаратуразнаўчых канферэнцый у нашай краіне: яна праводзіцца кожныя 2 гады ўжо на працягу 14 гадоў.

Адна з галоўных мэтаў канферэнцыі — асэнсаванне праз літаратуру стану сучаснага свету, месца і ролі славянства ў ім, перспектываў развіцця нашай цывілізацыі, мэтаў і задачаў, якія стаяць сёння перад чалавецтвам.

Сёлета ў працы навуковага форуму прынялі ўдзел больш за 250 літаратуразнаўцаў з 13 краінаў — Беларусі, Расіі, Украіны, Польшчы, Літвы, Латвіі, Румыніі, Балгарыі, Чэхіі, Славакіі, Карэі, Нігерыі, Камеруна. Сярод удзельнікаў канферэнцыі было каля 20 прафесараў і дактароў навук, чынны ўдзел у ёй узялі таксама акадэмікі, вядомыя паэты і пісьменнікі.

**Сняжана ЛІСОЎСКАЯ**

## АБ'ЯВЫ

**УСТАНОВА БДУ "НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧЫ ІНСТЫТУТ ФІЗІКА-ХІМІЧНЫХ ПРАБЛЕМ"**

**абвяшчае конкурс на замяшчэнне вакантных пасад:**

старшага навуковага супрацоўніка лабараторыі фізічнай хіміі і мадыфікацыі цэлюлозы;
старшага навуковага супрацоўніка лабараторыі хіміі тонкіх плёнак;
навуковага супрацоўніка лабараторыі хіміі тонкіх плёнак (2);
навуковага супрацоўніка лабараторыі нанахіміі;
навуковага супрацоўніка лабараторыі біяхіміі лекавых прэпаратаў;
малодшага навуковага супрацоўніка лабараторыі біяхіміі лекавых прэпаратаў.

**Тэрмін падачы дакументаў — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.**

**Дакументы прымаюцца на адрас: 220050, г. Мінск, вул. Ленінградская, 14, аддзел кадраў НДІ ФХП БДУ.**

**ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ КІРАВАННЯ І САЦЫЯЛЬНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ БДУ**

**абвяшчае конкурс на замяшчэнне пасад:**

загадчыка кафедры гуманітарных дысцыплін (1);
дацэнта кафедры гуманітарных дысцыплін (1);
выкладчыка кафедры сацыяльнай работы (1).

**Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.**

**Адрас: 220037, г. Мінск, вул. Батанічная, 15, Дзяржаўны інстытут кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ, аддзел кадраў, тэл. 210-01-10.**

## АСОБЫ

*Г.І. Марцынкевіч:*

# "Я аб'ездзіла ўвесь СССР"

**Для большасці студэнтаў выкладчык цікавы толькі як асоба, якая дае яму новыя веды. Але выкладчык мае свае праблемы, меркаванні і жаданні. Нам пашчасціла бліжэй пазнаёміцца з добрай выкладчыцай і цікавай суразмоўцай — Галінай Іосіфаўнай МАРЦЫНКЕВІЧ. Гутарка адбылася з нагоды юбілею Галіны Іосіфаўны — прафесара кафедры геаэкалогіі, доктара геаграфічных навук.**

**Яна нарадзілася ў горадзе Чэрвень Мінскай вобласці, але сапраўднай сваёй радзімай лічыць Брэст, куды пераехала разам з бацькамі ў маленстве. Закончыўшы школу з залатым медалём, Галіна Іосіфаўна хацела паступаць у МДУ, але бацькі далей за Мінск адпускаць не згадзіліся.**



**— Чаму выбралі менавіта геаграфічны факультэт БДУ?**

— Ехала паступаць на энергетычны факультэт політэхнічнага універсітэта, але месцаў для выдатнікаў ужо не было. З бацькам пайшлі ва універсітэт, дзе ў прыёмнай камісіі спакусілі палявымі практыкамі і экскурсіямі. Цяпер дзякую лёсу за такі паварот у жыцці.

Вучыцца было цікава, асабліва пад кіраўніцтвам такіх вядомых вучоных, як В.П. Якушка, В.А. Дзяменцьеў і многіх іншых. Паводле размеркавання Галіна Іосіфаўна трапіла ў Інстытут глебазнаўства. Працаваць было складана: у палявых экспедыцыях яна праводзіла штораз больш за паўгода.

— Лёс умяшаўся ў жыццё, — распавядае Галіна Іосіфаўна. — Я пабачыла аб'яву пра набор у аспірантуру. Вучоба ў аспірантуры была цікавай, асабліва пашчасціла з кіраўніком В.А. Дзяменцьевым, які стаў аўтарытэтам для мяне на ўсё жыццё.

Пасля аспірантуры Галіна Іосіфаўна пачала працаваць на факультэце, дзе з першых дзён чытала некалькі курсаў. У 1971 г. стала дацэнтам кафедры фізічнай геаграфіі СССР, распрацоўвала ландшафтную тэматыку. У 1992 г. абаранiла доктарскую дысертацыю, а ў 1994 г. стала прафесарам.

**— Кім бы Вы сталі, калі б была магчымасць усё пачаць спачатку?**

— Нічога не мяняла б у сваім жыцці. Я вельмі ўдзячна лёсу за свой жыццёвы шлях.

**— Ёсць мара ці мэта, якую хацелася б здзейсніць?**

— Паездка на Капакабану, сусветна вядомыя бразільскія пляжы! Я ўжо шмат дзе была: пабачыла амаль увесь СССР, Еўропу. Была ў Тунісе.

**— Месца на Зямлі, якое Вам мілей за ўсё?**

— Брэст, горад дзяцінства, дзе бавіла вольны час на рэчцы. У маладосці захаплялася веславаннем, плаваннем, валейболам і нават горнымі лыжамі. Спорт прайшоў праз усё маё жыццё.

**— Чым займаецеся цяпер?**

— У вольны час спяваю ва універсітэцкім хоры "Родніца", які шмат падарожнічае з канцэртамі. Вось і цяпер рыхтуемся паехаць у Латвію.

**— Што адчуваеце, працуючы з маладымі людзьмі?**

— Гэта неапісальнае пачуццё радасці ад кантакту са студэнтамі, якія ўсёй душой імкнуцца да ведаў, якія ты ім даносіш.

**Людміла ГРЭСЬ,
Юлія БОГДАН, студэнткі геаграфічнага факультэта
Фота Юліі ПАПОВАЙ**

## ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

# ПРЫНЦЭСЫ Ў ПАГОНАХ

***Усё часцей на розных факультэтах БДУ з'яўляюцца незвычайныя студэнты ў вайсковай форме. Гэта курсанты ваеннага факультэта БДУ. Ёсць сярод іх і дзяўчаты — напрыклад, на факультэце міжнародных адносін. Пра жыццё "прынцэс у пагонах" расказала малодшы сяржант Ірына ШМАТОК.***



**— Чаму ты выбрала ваенны факультэт?**

— Я проста не ўяўляла для сябе іншай будучыні, бо выхоўвалася ў сям'і ваеннаслужачых. А яшчэ, мабыць, таму, што ніколі легкадумна не ставілася да свайго лёсу, шукала стабільнасці. І гэтую стабільнасць я ўбачыла ў ваеннай кар'еры, таму абсалютна добраахвотна і свядома пайшла на гэты факультэт. Цяпер, калі вучуся ўжо на другім курсе, з поўнай адказнасцю магу сказаць, што не шкадую.

**— А чаму БДУ, а не Ваенная акадэмія, напрыклад?**

— У Ваеннай акадэміі дзяўчат прымаюць толькі на факультэт АСУ, а гэта азначае скіраванасць на тэхнічныя дысцыпліны. Яшчэ са школы я аддавала перавагу гуманітарным дысцыплінам, хацела вывучаць некалькі замежных моў, і факультэт міжнародных адносін БДУ дазваляе мне рэалізаваць запланаванае. Да таго ж, у Ваеннай акадэміі давялося б жыць у казарме.

**— Калі меркаваць па ўступнай кампаніі, колькасць дзяўчат, якія б жадалі паступіць на ваенны факультэт, дастаткова вялікая. Скажы колькі слоў пра залік па фізпадрыхтоўцы.**

— Залік прымаюць выкладчыкі БДУ. Яны арыентуюцца на сярэднія паказчыкі нарматываў, таму зусім не абавязкова дэманстраваць алімпійскія рэкорды, каб здаць залік. Але не трэба забываць і пра тое, што нават выдатная фізічная форма не зможа кампенсаваць недахоп ведаў.

**— Кожны дзень табе трэба хадзіць у вайсковай форме. Ты не саромеешся?**

— Было рознае. Раней было трохі крыўдна, што іншыя дзяўчаты могуць мяняць уборы, а ў мяне такой магчымасці няма. Але цяпер я да свайго знешняга выгляду стаўлюся спакойна: мне не трэба думаць, што апрануць.

**— А як складваюцца адносіны з іншымі студэнтамі факультэта міжнародных адносін?**

— У мінулым годзе мы, тады яшчэ першакурснікі, былі ў нечым як першапраходцы на некаторых факультэтах. Тады, канешне, на нас глядзелі як на нейкую "экзотыку": адны са смехам, другія з захапленнем. З часам усё ўнармавалася, да нас прывыклі, з'явілася шмат новых сяброў.

**— Чым твой дзень адрозніваецца ад працоўнага дня хлопцаў?**

— Ва ўсіх існуе расклад. У 8.00 адбываецца агульнае пастраенне на ваенным факультэце, дзе штодзённа з намі сустракаецца камандаванне: камандзір роты, камандзір батальёна і начальнік факультэта. Пасля гэтага адбываецца развод па месцах вучобы. У тых, хто вучыцца ў другую змену, пачынаецца самападрыхтоўка, калі курсанты павінны рыхтавацца да заняткаў. У першай змены самападрыхтоўка — пасля заняткаў. Пасля заканчэння вучобы і падрыхтоўкі дзяўчаты едуць дадому, а хлопцы — у казарму. Увечары ў курсантаў адбываюцца паверкі і пастраенне пасля 21.00. У гэтым і заключаецца адрозненне нашага рэжыму. Але, я ўпэўнена: калі б мы жылі ў казарме, то выконвалі б тыя ж самыя патрабаванні.

**— Чым ты захапляешся ў вольны час?**

— На жаль, на хобі часу не хапае. Амаль увесь вольны час ідзе на падрыхтоўку да заняткаў. Асабліва цяжка даводзіцца падчас сесіі.

**— А на асабістае жыццё часу хапае?**

— Так, мне хапае, таму што (усміхаецца) мой хлопец таксама ваенны.

**— Што ты можаш пажадаць дзяўчатам, якія ў будучыні хочуць паступаць на ваенны факультэт?**

— Смела ідзіце насустрач да сваёй мары, нічога не бойцеся. Спачатку будзе цяжка прывыкнуць да новага распарадку жыцця, але напрыканцы вучобы вы зразумееце ўсё хараство ваеннага факультэта. І памятайце: перад вамі адчынены ўсе дзверы, трэба толькі імкнуцца.

**Вольга ДУБІНА**

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты — Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 149 ад 30 жніўня 2005 года

18 кастрычніка 2005 года
Падпісана да друку 17.10.2005 г.
Зак. 866. Тыраж 1500 экз. Ум. друк. арк. 1
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
ЛП № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Тацццяна КАЗАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, праcп. Незалежнасці, 4
Прыёмная рэдакцыі: вул. Бабруйская, 7, пакой 411, тэлефон 209-53-45,
e-mail: Gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by